ДУК ”Ушацкая цэнтралізаваная сістэма“
Ушацкая раённая бібліятэка імя Е.Я.Лось
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

# НАША СПАДЧЫНА

Біябібліяграфічны паказальнік

па творчасці

# Тамары Барадзёнак

Ушачы

2023

ББК 91.9 : 83 (4Беи-Бел)

Н 37

Складальнік: Г. П. Талстая

Адказны за выпуск: Л. М. Шкаруба

Біябібліяграфічны паказальнік утрымлівае звесткі аб артыкулах і публікацыях, прысвечаных жыццю і творчасці паэтэсы Тамары Барадзёнак.

Паказальнік адрасаваны краязнаўцам, бібліятэчным супрацоўнікам, студэнтам, а таксама ўсім тым, хто цікавіцца беларускай літаратурай і фальклорам. Разлічаны на шырокае кола карыстальнікаў.

Мой верш ад бароў духмяных,
Ад зорнага неба ў жніўні,
Ад соку ігруш крамяных,
Ад плёскату хваль Умільна.
Мой верш – ад кастроў Купалля,
Ад сполаху ўночы зарніцаў,
Ад рук, што мяне ўзгадавалі,
Ад чыстай вады Альзяніцы,
Ад роднае песні матчынай –
Як дорага мне гэта спадчына!..

*Тамара Барадзёнак*

**Багата Ушаччына паэтычнымі талентамі.**

На прыгожай матырынскай зямлі нарадзілася і вырасла мясцовая паэтэса Тамара Барадзёнак. Мы можам па праву ганарыцца яе паэтычным талентам. Вершы і песні паэтэсы вызначаюцца шчырасцю, замілаваннем, увагай да ўсяго, што акружае гэту абаяльную жанчыну.

Тамара Дзмітрыўна Барадзёнак нарадзілася 4 мая 1959 года ў вёсцы Казіно Селішчанскага с/с Ушацкага раёна. Пасля заканчэння Матырынскай васьмігадовай школы ў 1974 годзе паступіла на фельчарскае аддзяленне Полацкага медыцынскага вучылішча, якое скончыла ў 1978 годзе і вярнулася на сваю родную Ушаччыну. Спачатку працавала ў цэнтральнай раённай бальніцы, потым медыцынскай сястрой у дзіцячым садзе-яслях № 1, а пасля ў дзіцячым садзе-яслях № 26 у гарпасёлку.

Пазаштатным карэспандэнтам газеты ”Віцебскі рабочы“ працавала з 1995 года па 2000.

У 2005 годзе Тамара Барадзёнак прынята у Саюз пісьменнікаў Рэспублікі Беларусь.

Свой першы верш – пра журавоў, што адлятаюць у вырай – маленькая Тамара напісала, калі было ёй усяго сем гадоў. Першыя публікацыі былі ў мясцовай газеце ”Патрыёт“. У Тамары Дзмітрыеўны шматбаковыя спробы пяра: акрамя напісання тэкстаў

песень, прозы, паэзіі, яна паспрабавала сябе ў такім сур’ёзным жанры, як байкі і гумарэскі. Вершаваны гумар Тамары Дзмітрыеўны трэба адзначыць як сучасны, трапны, запамінальны і павучальны.

Многія яе меладычныя вершы самі просяцца на музыку. Таму невыпадкова прафесійныя музыканты-землякі Сяргей Парашкін, Мікола Віткоўскі (1946-2009), Сяргей Мядзведзеў (1953-2021), Ігар Сідарчук, Алег Іваноў напісалі музыку на шматлікія вершы Тамары Барадзёнак.

З 2007 года калектыў дзяржаўнага ансамбля ”Талака“ Віцебскай філармоніі выконвае песні на словы Т. Барадзёнак. Песняй ”Прывітальная“ калектыў пачынае свае канцэрты, з якімі яны аб’ехалі ўсе гарады Еўропы. Песні ”Лірычная“ і ”У каханай вочы чорны“ таксама гучаць у выкананні ”Талакі“.

Песня ”Леса Ушаччыны“ у выкананні Анастасіі Карымавай на словы Тамары Барадзёнак і музыку Сяргея Мядзведзева стала гімнам Арэхаўскай школы Ушацкага раёна.

Ушаччына апета многімі вядомымі паэтамі, але Тамара Барадзёнак знаходзіць свае прачулыя словы для выказвання захаплення мужным партызанскім і працоўным краем.

На творчым рахунку Тамары Дзмітрыеўны 25 выдадзенных зборнікаў, шматлікія публікацыі ў абласных і рэспубліканскіх газетах: ”Літаратура і мастацтва“, ”Звязда“, ”Беларуская ніва“, ”Віцебскі рабочы“, ”Народнае слова“, ”Віцьбічы“, ”Витебские вести“, раённай газеце ”Патрыёт“, і часопісах: ”Маладосць“, ”Вожык“, ”Гаспадыня“, ”Работница“, у дзіцячым часопісе ”Каласавічок“. Падборкі яе вершаў уваходзяць у калектыўныя зборнікі беларускіх паэтаў: ”Тутэйшы шляхціч“, ”Традыцыйная культура і дзеці“, ”Дзвіна“ за 2000, 2005 гады.

У перыяд з 2009 па 2019 гады ў газеце ”Вести потребкооперации“ у рубрыцы ”На крыльях Пегаса“ было апублікавана больш за 80 падборак вершаў Т. Барадзёнак. Улічваючы тыраж газеты, які выходзіў у колькасці 50 тысяч экзэмпляраў, з творчасцю паэтэсы змаглі пазнаёміцца жыхары ўсіх абласцей рэспублікі. Многія творчыя калектывы Беларусі ўключылі ў свой рэпертуар лірычныя і гумарыстычныя вершы нашай зямлячкі. У Брэсцкай вобласці творчы калектыў ”Рябинушки“ радуе сваіх

гледачоў дэкламацыяй баек і гумарэсак. Каля 20 гадоў выступае як чытальнік беларускага гумару жыхарка г. Магілёва Тамара Міхайлаўна Цыганкова. Ва Ушачах, Лепелі, Полацку, Оршы, Бабруйску і зараз гучаць вершы паэтэсы на розных мерапрыемствах.

Паэтэса аднавіла два абрады: калядны і велікодны, у якіх сама ўдзельнічала на сваёй малой радзіме разам з народным фальклорным калектывам ”Матырынская спадчына“. Мілагучны спеў ”Матырынскай спадчыны“ наклаў свой адметны адбітак на творчасць паэтэсы Тамары Барадзёнак, там прайшло яе дзяцінства і юнацтва. З маленства захаплялася старадаўнімі песнямі, што гучалі і на вясковых святах, і якія проста спявалі вясковыя жанчыны. Вельмі прыгожа спявала бабуля паэтэсы Аўласенка Марыя Іванаўна (маці бацькі). З першага дня існавання гурта ”Матырынская спадчына“ у ім спявала маці паэтэсы Аўласенка Зінаіда Аляксандраўна. Удзельніцы гурта часта запрашаюць Тамару Барадзёнак да сябе на сустрэчы, яны любяць яе творчасць. Гэтыя сустрэчы заўсёды вельмі цёплыя і на іх заўсёды гучаць песні. Менавіта цудоўныя фальклорныя напевы жанчын натхняюць паэтэсу ствараць новыя лірычныя творы.

Тамара Дзмітрыеўна – часты госць ва Ушацкай раённай бібліятэцы імя Е.Я.Лось, бо яна з’яўляецца ўдзельніцай клуба цікавых сустрэч ”Ушачане“. На пасяджэннях клуба гучаць вершы паэтэсы. Многія пасяджэнні прысвечаны прэзентацыям новых зборнікаў Тамары Барадзёнак.

Творчасць паэтэсы аздабляе дзейнасць народнага клуба творчых сустрэч ”Муза“ пры Ушацкім раённым цэнтры культуры і народнай творчасці.

Вершаваныя сказанні аб святых пакутніках выдадзены ў 2019-2022 гадах. Камп’ютэрны дызайн і мастацкае афармленне выканала настаўніца нядзельнай школы пры храме святых вялікапакутніц Мінадоры, Мітрадоры і Німфадоры Марыя Мікалаеўна Правада. Менавіта яна параіла Тамары Дзмітрыўне паспрабаваць сябе ў напісанні духоўнага жанру.

Пачытаўшы творы Тамары Барадзёнак становішся чысцей душою і думкамі.

*Г.П. Талстая, бібліёграф Ушацкай раённай бібліятэкі імя Е.Лось*

## Творы Тамары Барадзёнак

1. **Барадзёнак, Т. Д. А я люблю…** : вершы, навелы / Тамара Дзмітрыеўна Барадзёнак. – Полацк : ПП ”Спадчына Ф. Скарыны“, 1996. – 155 с.
2. **Барадзёнак, Т. Д. Мелодыі душы маёй** : песні / Тамара Дзмітрыеўна Барадзёнак. – Полацк : ПП ”Спадчына Ф. Скарыны“, 1997. – 33 с.
3. **Барадзёнак, Т. Д. І жартам, і ўсур’ёз** : байкі, гумарэскі / Тамара Дзмітрыеўна Барадзёнак. – Полацк : ПП ”Спадчына Ф. Скарыны“, 1998. – 40 с. : іл.
4. **Барадзёнак, Т. Д. Усміхніся, сонейка!** : вершы, п’есы-казкі / Тамара Барадзёнак; малюнкі Вольгі Арлоўскай. – Полацк : ПП ”Спадчына Ф. Скарыны“, 1999. – 18 с.
5. **Барадзёнак, Т. Д. Мой верасень** : вершы / Тамара Дзмітрыеўна Барадзёнак. – Полацк : ПП ”Спадчына Ф. Скарыны“, 2004. – 35 с.
6. **Барадзёнак, Т. Д. Калыханкі лясной палянкі** / Тамара Дзмітрыеўна Барадзёнак. – Полацк : ПП ”Спадчына Скарыны“, 2004. – 14 с. : іл.
7. **Барадзёнак, Т. Д. З вытокаў матырынскай спадчыны** / Тамара Дзмітрыеўна Барадзёнак; прадмова І. Урбан; камп. дызайн В. Гарадзецкая. – Ушачы : Ушацкая цэнтральная раённая бібліятэка, 2006. – 18 с. : іл.
8. **Барадзёнак, Т. Д. Лунай, песня!** : зборнік песенных тэкстаў / Тамара Дзмітрыеўна Барадзёнак. – Ушачы, 2006. – 27 с.
9. **Барадзёнак, Т. Д. Вера, надзея, любоў** : вершы / Тамара Дзмітрыеўна Барадзёнак. – Полацк : РУПП ”Наследие Скорины“, 2007. – 36 с. : іл.
10. **Барадзёнак, Т. Д. Старонка мая баравая** : вершы / Тамара Дзмітрыеўна Барадзёнак. – Полацк : РУПП ”Наследие Скорины“, 2008. – 36 с. : іл.
11. **Барадзёнак, Т. Д. Пад ветразем надзеі** : вершы / Тамара Дзмітрыеўна Барадзёнак. – Полацк : РУПП ”Наследие Скорины“, 2009. – 36 с. : іл.

12. **Барадзёнак, Т. Д. Родныя напевы** : прысвячаецца 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Году роднай зямлі : зборнік вершаў / Тамара Дзмітрыеўна Барадзёнак. – Ушачы, 2009. – 20 с.
13. **Барадзёнак, Т. Д. Купалася зорка ў крыніцы** : вершы, песні, гумарэскі / Тамара Дзмітрыеўна Барадзёнак; фота Ігара Агурцова. – Полацк : РУПП ”Наследие Скорины“, 2011. – 48 с. : іл.
14. **Барадзёнак, Т. Д. Смяяцца не грэх** : гумарэскі / Тамара Дзмітрыеўна Барадзёнак; рэд. М. Р. Бункевіч. – Ушачы, 1997. – с. 12.
15. **Барадзёнак, Т. Д. З любоўю да роднага краю, да роднай святое зямлі** / Тамара Дзмітрыеўна Барадзёнак; камп’ютэрны дызайн: Г. П. Талстая. – Ушачы, 2016. – 16 с.
16. **Барадзёнак, Т. Д. У нас на Ушаччыне** : зборнік вершаў / Тамара Дзмітрыеўна Барадзёнак. – Ушачы : Ушацкая раённая бібліятэка імя Е.Я.Лось, 2016. – 20 с. : іл.
17. **Барадзёнак, Т. Д. Жарты на прызбе** : байкі, гумарэскі / Тамара Дзмітрыеўна Барадзёнак; камп’ютэрны дызайн: А. У. Грамянкова, І. С. Міхейка. – Ушачы : Ушацкая раённая бібліятэка імя Е.Я.Лось, 2018. – 20 с.
18. **Барадзёнак, Т. Д. Святло маёй малой радзімы** : паэтычны зборнік / Тамара Дзмітрыеўна Барадзёнак; склад. Г. М. Кашненка, камп. дызайн П. М. Драгун. – Ушачы : Ушацкая раённая бібліятэка імя Е.Я.Лось, 2019. – 16 с.
19. **Барадзёнак, Т. Д. Сказанне аб жыцці святой вялікапакутніцы Параскевы Пятніцы** / Тамара Дзмітрыеўна Барадзёнак; дызайн М. М. Правада. – Ушачы : Ушацкая раённая бібліятэка імя Е.Я.Лось, 2019. – 28 с. : іл.
20. **Барадзёнак, Т. Д. Святло душы** : вершы / Тамара Дзмітрыеўна Барадзёнак; дызайн М. М. Правада. – Ушачы, 2019. – 20 с. : іл.
21. **Барадзёнак, Т. Д. З бабулінага куфэрка** : зборнік казак / Тамара Дзмітрыеўна Барадзёнак; рэдактар Г. М. Кашненка. – Ушачы : Ушацкая раённая бібліятэка імя Е.Я.Лось, 2020. – 16 с. : парт.

22. **Барадзёнак, Т. Д. Слухаючы цішыню** : вершы, гумарэскі / Тамара Дзмітрыеўна Барадзёнак ; рэд. і камп. дызайн Г. М. Кашненка, К. П. Коршун. – Ушачы : Ушацкая раённая бібліятэка імя Е.Я.Лось, 2022. – 28 с. : парт., фот., іл.
23. **Бородёнок, Т. Д. Сказание о житии святых мучениц Минодоры, Митродоры и Нимфодоры** / Тамара Дмитриевна Бородёнок; дизайн М. Н. Провада. – Ушачи, 2022. – 16 с. : ил.
24. **Барадзёнак, Т. Д. На сцяжынах памяці** : вершы / Тамара Дзмітрыеўна Барадзёнак; рэдактар і камп'ютарны дызайн К. П. Коршун. – Ушачы : Ушацкая раённая бібліятэка імя Е.Я.Лось, 2022. – 24 с. : парт., фот., іл.
25. **Бородёнок, Т. Д. Сказание о житии священномученика Константина Жданова, пресвитера Шарковщинского** / Тамара Дмитриевна Бородёнок; дизайн М. Н. Провада. – Ушачи, 2022. – 20 с. : ил.

# Узнагароды Тамары Барадзёнак

**2009 год.** Грамота Ушачского райисполкома за активное участие в общественной жизни района, участие в значимых мероприятиях районного масштаба, за творческие достижения и в связи с юбилеем.

**2019 год.** Грамота Ушачского райисполкома за активное участие в общественной жизни района, плодотворную работу, многолетнее тесное сотрудничество с творческими коллективами района, воспитание подрастающего поколения на лучших примерах литературы и поэзии и в связи с юбилеем.

**2019 год.** Грамота Витебского областного управления культуры за большие творческие достижения в литературе и поэзии и в связи с юбилеем.

**2019 год.** Диплом Управления культуры Витебского облисполкома ГУ ”Витебский областной методический центр народного творчества“ во время проведения в г.п. Лиозно областного праздника-конкурса самодеятельных поэтов и композиторов ”Песні сунічных бароў“ в номинации ”Лучший песенный текст“.

**2021 год.** Сертификат финалиста открытого конкурса авторской песни, поэзии, исполнительного мастерства и визуальных искусств в номинации ”Поэзия. Свободная тематика“ выдан ГУК ”Витебск“ на фестивале ”Витебский листопад“.

**2021 год.** Сертификат финалиста открытого конкурса авторской песни, поэзии, исполнительного мастерства и визуальных искусств в номинации ”Поэзия. Стихи для детей“ выдан ГУК ”Витебск“ на фестивале ”Витебский листопад“.

**2021 год.** Диплом финалиста IV литературного фестиваля ”Центр Европы“ с международным участием в номинации ”Языком Я. Купалы и Я. Коласа“. г. Полоцк.

**2021 год.** Дыпломам III ступені за ўдзел у паэтычным конкурсе па фотаздымках адзначана Ушацкім раённым цэнтрам культуры і народнай творчасці.

**2022 год.** Диплом финалиста V литературного форума ”Центр Европы“ с международным участием в номинации ”Языком Я. Купалы и Я. Коласа“.

**2022 год.** Диплом за III место на приз зрительских симпатий в номинации ”Языком Я. Купалы и Я. Коласа“. г. Полоцк.

**2022 год.** Диплом финалиста конкурса переводов Давида Симановича ”Языки не для тьмы и злодейства…“, посвященного 90-летию со дня рождения поэта. г. Витебск.

**2022 год.** Диплом финалиста III межрегионального литературного конкурса ”Браславская обитель 2022“ в номинации ”Поэзия. Родина моя малая“.

**2022 год.** Благодарственное письмо в благословение за труды на благо Полоцкой епархии.

## Бібліяграфія


1. Аб камісіі па прэміях Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ў галіне літаратуры, мастацтва, журналістыкі і самадзейнай творчасці // Літаратура і мастацтва. – 2009. – 20 лютага. – С. 3.
2. Адамовіч, Л. Ад матчынай любові / Л. Адамовіч // Віцебскі рабочы. – 2006. – 27 чэрвеня. – С. 4.
3. Багдановіч, Н. Дадаць святла ў вочы і дабрыні ў душу / Н. Багдановіч // Патрыёт. – 2012. – 13 чэрвеня. – С. 3.
4. Багдановіч, Н. Каб Беларусь магла спяваць / Н. Багдановіч // Патрыёт. – 2020. – 5 лютага. – С. 8.
5. Беляжэнка, Б. ”Мой верасень“ / Б. Беляжэнка // Віцьбічы. – 2004. – 22 ліпеня. – С. 11.
6. Беляжэнка, Б. Ва Ушачы – за песнямі / Б. Беляжэнка // Віцебскі рабочы. – 1998. – 31 октября. – С. 7.
7. Волах, Г. І. Тамара Барадзёнак. Старонка мая баравая / Г. І. Волах // Патрыёт. – 2008. – 22 лістапада. – С. 8.
8. Воліна, К. Душы маёй песні / К. Воліна // Патрыёт. – 1998. – 17 кастрычніка. – С. 2.
9. Гарбаценка, Т. Творчасць нашых землякоў. Тамара Барадзёнак. Пад ветразем надзеі. / Т. Гарбаценка // Патрыёт. – 2009. – 30 красавіка. – С. 12.
10. Денисов, В. И песнями становятся стихи / Василий Денисов // Народнае слова. – 2009. – 2 чэрвеня. – С. 4.
11. Дзянісаў, В. Творчасць не мае мяжы / Васіль Дзянісаў // Патрыёт. – 2009. –23 мая. – С. 8.
12. Кавалеўская, К. Выдадзены зборнік / К. Кавалеўская // Патрыёт. – 2011. – 23 красавіка. – С. 2.
13. Казачонак, І. ”Мелодыі душы маёй“ / І. Казачонак // Патрыёт. – 2012. – 26 снежня. – С. 2.
14. Камаркова, В. ”Мае творы – мае дзеці“ / В. Камаркова // Патрыёт. – 2018. – 18 жніўня. – С. 5.
15. Камаркова, В. Гарыць агеньчык творчасці / В. Камаркова // Патрыёт. – 2019. – 29 мая. – С. 8.
16. Кандыдаты ўжо вызначаны // Культура. – 2009. – № 9. – С. 3.

17. Карпаў, Р. Святло і смутак душы / Р. Карпаў // Патрыёт. – 2008. – 26 студзеня. – С. 8.
18. Пашковіч, А. Гучалі родныя напевы / А. Пашковіч // Патрыёт. – 2010. – 12 мая. – С. 3.
19. Полазава, Н. Некалькі дзён таму прыйшла радасная вестка. У Саюз пісьменнікаў Рэспублікі Беларусь прынята наша землячка – паэтэса Тамара Барадзёнак. / Н. Полазава // Патрыёт. – 2005. – 5 сакавіка.
20. Раманаў, Ф. Калі душа спявае… / Ф. Раманаў // Патрыёт. – 1996. – 30 лістапада. – С. 2.
21. Родныя напевы Тамары Барадзёнак : дапаможнік / складальнік і камп’ютарны дызайн Г. П. Талстая; адказны за выпуск Л. Ф. Голуб. – Ушачы : Ушацкая раённая бібліятэка імя Е.Я.Лось, 2011. – 6 с. : іл.
22. Салтук, А. У добры шлях! / А. Салтук // Віцебскі рабочы. – 2005. – 3 лістапада. – С. 5.
23. Сауліч, У. Сур’ёзныя жарты / У. Сауліч // Літаратура і мастацтва. – 1999. – 5 сакавіка.
24. Талстая, Г. Ад сэрца, з любоўю / Г. Талстая // Патрыёт. – 2015. – 16 ліпеня. – С. 2.
25. Урбан, І. ”І на мове роднай гаварыць“ / І. Урбан // Народнае слова. – 1997. – 20 сакавіка. – С. 2.
26. Урбан, І. ”Усміхніся, сонейка“ – дзеткам / І. Урбан // Патрыёт. – 1999. – 2 кастрычніка. – С. 2.
27. Урбан, І. З песні слоў не выкінеш / І. Урбан // Віцебскі рабочы. – 1997. – 21 кастрычніка. – С. 3.
28. Урбан, І. Я. ”А я люблю…“ / І.Я. Урбан // Віцебскі рабочы. – 1996. – 26 лістапада.
29. Ушачане – людзі творчыя // Патрыёт. – 2008. – 8 мая. – С. 12.
30. Чанцова, С. Вершы простыя, зямныя… : пра кнігу Т. Барадзёнак ”Мой верасень“ / С. Чанцова // Патрыёт. – 2004. – 14 ліпеня. – С. 2.
31. Шах, А. Адкрытасць пачуццяў / А. Шах // Патрыёт. – 1996. – 16 лістапада. – С. 3.
32. Яўгенава, І. І на мове роднай гаварыць / І. Яўгенава // Віцебскі рабочы. – 1996. – 7 снежня. – С. 5.

## Імянны паказальнік

Адамовіч, Л. 1
Багдановіч, Н. 2, 3
Барадзёнак, Т. 6, 8, 18, 20, 28
Беляжэнка, Б. 5, 6
Волах, Г. І. 7
Воліна, К. 8
Гарбаценка, Т. 9
Голуб Л. Ф. 21
Денисов, В. 10
Дзянісаў, В. 11
Кавалеўская, К. 12
Казачонак, І. 13
Камаркова, В. 14, 15
Карпаў, Р. 17
Пашковіч, А. 18
Полазава, Н. 19
Раманаў, Ф. 20
Салтук, А. 22
Сауліч, У. 23
Талстая, Г. 21, 24
Урбан, І. 25, 26, 27, 28
Чанцова, С. 30
Шах, А. 31
Яўгенава, І. І 32

Усё часцей у роднай Беларусі
Прыносяць змены шпаркія гады,
Ды ўсё ж застацца ў вершах спадзяюся
Я на сваёй Ушаччыне заўжды.

*Тамара Барадзёнак*

*2022 г.*

**З сямейнага фотаальбома**





Тамара – навучэнка Матырынскай васьмігадовай школы. 14 гадоў.

Тамара Дзмітрыеўна – маці дваіх дзяцей: сына Дзмітрыя і дачкі Наталлі. 33 гады.

 
 

Бацькі Тамары Дзмітрыўны: Дзмітрый Іванавіч Аўласенка (1934-1998), Зінаіда Аляксандраўна (Рудзёнак) (1932-2015).

 

Тамара ў маленстве (каля двух гадоў). У маці на руках.



Чатырохгадовая Тамара (злева) з сябрамі з вёскі Заазер’е Зінай Мядведскай і Васілём Сакаловым.




Пасведчанне няштатнага карэспандэнта газеты ”Віцебскі рабочы“ за подпісам галоўнага рэдактара Уладзіміра Раманоўскага.




Пасведчанне журналіста за подпісам старшыні Саюза журналістаў Беларусі Леаніда Аляксеевіча Крэскіяна.





САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

ЧЛЕНСКІ БІЛЕТ № 708

Прозвішча Барадзёнак

Імя Тамара

Імя па бацьку Дзмітрыеўна

(літаратурны псеўданім)

Час уступлення ў СПБ 2004 г.

Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі

Асабісты подпіс



Тамара Дзмітрыеўна з удзельніцамі народнага фальклорнага гурта ”Матырынская спадчына“ ля роднай хаты ў вёсцы Матырына. 2006 год.



Маці Тамары Дзмітрыўны Зінаіда Аляксандраўна – ўдзельніца народнага фальклорнага гурта ”Матырынская спадчына“ каля роднай хаты ў вёсцы Матырына. 2006 год.




Тры пакаленні жанчын з роду Рудзёнак. Рудзёнак – дзявочае прозвішча маці паэтэсы. На свяце вёскі Матырына. 2006 год.




Гучыць песня на словы Тамары Барадзёнак у выкананні Вольгі Жукавай, акампаніруе кампазітар Сяргей Мядзведзеў.




Народны фальклорны гурт ”Матырынская спадчына“ віншуе паэтэсу Тамару Барадзёнак з 50-гадовым юбілеем.




50-гадовы юбілей паэтэсы. Удзельнікі мерапрыемства Таццяна Гарбаценка, Васіль Дзянісаў, Тамара Барадзёнак, Валерыя Міхно, Сяргей Мядзведзеў, Вольга Жукава. Арэхаўскі СДК. 2009 год.




Тамара Дзмітрыўна ва Ушацкай раённай бібліятэцы ў час прэзентацыі зборніка ”Вера, надзея, любоў“. 2007 год.



Фотаздымак Ігара Агурцова. 2011 год.



Дзецьмі для маёй душы
Сталі ўсе яны міжволі.
Сэрца кажа мне – пішы!
Гэта мой і крыж, і доля.

З імі шчасцем і бядой
Падзялюся я заўсёды.
З імі спраўлюся з нудой,
Пераэжыць змагу нягоды.

Тое давяраю ім,
Што нікому не даверу.
Думкам месца ў іх маім,
І надзея ў іх, і вера.

З імі быць заўжды хачу
Не апошняй і не першай.
Як умею, іх пішу,
А імя ім – проста вершы.

*Тамара Барадзёнак*




Ушанаванне з 55-годдзем ва Ушацкай раённай бібліятэцы імя Е.Лось. 2014 г.



50-гадовы юбілей Тамары Барадзёнак. Сквер у г.п. Ушачы. 2009 год.



Тамара Дзмітрыеўна з маці пасля святкавання 20-ці гадавага юбілею творчай дзейнасці. г.п. Ушачы. Верасень 2012 года.



Выканаўца самаробнай кнігі Г. П. Талстая з аўтарам Тамарай Дзмітрыўнай Барадзёнак у скверы ва Ушачах на свяце Дня незалежнасці. 2017 год.



Дуэт ”Талакі“ – выканаўцы песні ”У каханай вочы чорны“ на словы Тамары Барадзёнак. г. п. Ушачы. 2016 год.





Унукі Станіслаў і Юлія. 2018 год.
Дачка Наталля са сваімі дзецьмі Станіславам і Юліяй. г.п. Ушачы. 2019 год.





Сын Дзмітрый Юр’евіч Барадзёнак. г. Масква. 16.10 2021
Муж Барадзёнак Юрый Васільевіч. 1992 год.




Ганаровую грамату ўручае старшыня Ушацкага райвыканкама Генадзь Уладзіміравіч Аўдошка. 2019 год.




Каманда з Ушач на абласным свяце-конкурсе самадзейных паэтаў і кампазітараў ”Песні сунічных бароў“. Лёзна. 2019 год.



Падчас прэзентацыі зборніка ”Святло маёй малой радзімы“.




Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама П.А.Алексяёнак віншуе паэтэсу з выхадам кнігі ”Святло маёй малой радзімы“. Ушацкая раённая бібліятэка імя Е.Я.Лось. 2020 г.




Прэзентацыя зборніка ”На сцяжынах памяці“ ва Ушацкай раённай бібліятэцы імя Е.Я.Лось. 2023 год.



Калядны абрад у вёсцы Белае ў этнасядзібе ”Рыбакова хата“ гаспадыні Ірыны Навагродскай. Паэтэса з клубам цікавых сустрэч ”Ушачане“. 2021 год.



Уладыка Полацкі і Глыбоцкі Ігнацій уручае Тамары Барадзёнак Ліст Падзякі ад Полацкай епархіі на харамавым свяце ў храме святых вялікапакутніц Мінадоры, Мітрадоры і Німфадоры. 23 верасеня 2022 г.



З выхаванцамі нядзельнай школы пры храме святых вялікапакутніц Мінадоры, Мітрадоры і Німфадоры і Ўладыкам Полацкім і Глыбоцкім Ігнаціем. 2022 год.




Фінал конкурсу перакладаў вершаў Давіда Сімановіча да 90-годдзя паэта. Віцебская абласная бібліятэка. 2022 год.



З калектывам ансамбля ”Талака“ пасля канцэрта ва Ушачах. 2022 год.




На конкурсе ”Паэт-артыст“ на літаратурным форуме з міжнародным удзелам ”Центр Европы“. Г. Полацк. 2022 год.




30 гадоў літаратурнай дзейнасці Тамары Дзмітрыеўны Барадзёнак аздобіла духоўная лірыка. Пасяджэнне народнага клуба творчых сустрэч ”Муза“.




Прэзентацыя зборніка ”На сцяжынах памяці“ ва Ушацкай раённай бібліятэцы імя Е.Я.Лось. 2023 год.

**Змест:**

Барадзёнак Т. Мой верш ад бароў духмяных………………... 3
Талстая Г. П. Багата Ушаччына паэтычнымі талентамі…….. 3
Творы Тамары Барадзёнак……………………………………….. 6
Узнагароды Тамары Барадзёнак……………………………… 9
Бібліяграфія……………………………………………………… 10
Імянны паказальнік…………………………………………… 12
Барадзёнак Т. Усё часцей у роднай Беларусі………………… 13
З сямейнага фотаальбома……………………………………… 13
Барадзёнак Т. Дзецьмі для маёй душы……………………….. 22

**Наша спадчына** : біябібліяграфічны паказальнік па творчасці Тамары Барадзёнак / складальнік Г. П. Талстая. – Ушачы : ДУК ”Ушацкая цэнтралізаваная сістэма“, Ушацкая раённая бібліятэка імя Е.Я.Лось, аддзел абслугоўвання і інфармацыі, 2023. – 36 с. : іл., парт., фот.